*Аляксей Камінскі*

# АРХАІЧНАЕ РАЗУМЕННЕ СВЯТА

Святочны каляндар беларусаў – своеасаблівы дзённік і аўтэнтычная энцыклапедыя беларускага сялянскага побыту – уяўляе складаную сістэму з мноствам самастойных, завершаных па форме і змесце абрадаў і свят, структурным элементам якой з'яўляецца гадавы рух сонца.

Першымі, яшчэ ў старажытныя часы, узніклі святы, якія былі звязаны з земляробчым календаром продкаў усходніх славян, вызначаўся тыпам гаспадаркі і кліматычнымі ўмовамі, і па ўяўленням чалавека ўплывалі на прыбытак ў статку, забеспячэнне багатага ўраджаю, ладу ў сям'і. Шматлікія святы ў старажытнасці былі прымеркаваны да пачатку ці заканчэння гаспадарчых заняткаў, кліматычных сезонаў, руху Сонца, Месяца і адлюстроўвалі цесную ўзаемасувязь чалавека і Сусвету, мікра- і макракосмасу. Для таго, каб забяспечыць гэту сувязь падчас свята здзяйсняліся разнастайныя магічныя рытуалы. Акрамя таго, некаторыя святы былі цесна звязаны з узнаўленнем у сучаснасці той ці іншай сакральнай падзеі, якая адбывалася ў міфічным мінулым. У дахрысціянскім грамадстве найбольш важнымі сімвалічнымі формамі, здольнымі замацаваць у калектыўнай свядомасці традыцыйныя і навацыйныя схемы сацыякультурнага быцця з'яўляліся міфы, абрады, рытуалы, сістэма табу і татэмічных культаў. Відавочна, што прыкладам і ўзорам для ўзнікнення рытуальных дзей першабытнага чалавека з'яўляліся паводзіны птушак і жывёл.

«У архаічны перыяд людзі жылі ў атмасферы цуда, якое лічылі штодзённай рэчаіснасцю. Калектыўная свядомасць дамінавала над індывідуальным» [2, с. 108, 191]. Вера ў слова, сімвалы, малюнкі была бязмежна і не прымала ніякай крытыкі, а свет успрымаўся як космас, які кіруецца прынцыпамі ўсяленскага парадку і функцыянуе ў размераным рытме [3, с. 223]. Свята ў гэты перыяд існавала як распаўсюджаная рэгулярная фаза калектыўнага жыцця, мэтай якой было звярнуць увагу на ўсе каштоўнасці групы ў спецыяльна вызначаны для гэтага час. Удзел у свяце ўваходзла ў комплекс абавязкаў кожнага з прадстаўнікоў абшчыны, і адначасова прымала форму карпаратыўнага патрыятызму перад ёй. Непадпарадкаванне правілам і невыкананне традыцыйных умоў удзелу ў цырыманіяле, пагражала антаганісту спагнаннямі і пакараннямі. Асноватворным прынцыпам дагістарычнага свята можна лічыць татальную актывізацыю ўсіх яго ўдзельнікаў. Сваёй эмацыянальнасцю, відовішчнасцю, весялосцю, адхіленнем ад паўсядзённых правіл і нормаў свята заўсёды з'яўлялася своеасаблівым *эксцэсам* у межах паўсядзённасці, урачыстым парушэннем забароны. «Не таму, што людзям весела і яны прытрымліваюцца якога-небудзь загада, а таму, што эскцэс складае сутнасць свята» [4, с. 362]. У гэтым сакральным перыядзе продкі вылучалі не толькі магічную эфектыўнасць, якая згодна павер'ям матэрыялізавалася ў пладнасці жанчын, багацці ўраджаю на будучы год, але і актыўны ўсплекс калектыўнай энергіі, «выхад за межы звычайных умоў жыцця, існуючай маралі, шалёную святочную ўзбуджанасць, хваляванне, якія адпавядалі пэўнаму імпульсу дэтумесцэнцыі» [3, с. 221].

Выдатны даследчык духоўнай культуры і гісторык рэлігіі М. Эліадэ лічыў, што для першабытнага менталітэту татальнае штогадовае ўзнаўленне абрадава-рытуальных дзей міжцыклічных эксцэсаў садзейнічала назапашванню ведаў аб паходжанні і гісторыі кожнай з сусветна-касмічных і прыродных з'яў. Па ўяўленнях продкаў гэтыя індывідуальныя і гістарычныя пазнанні абавязкова спатрэбяцца, каб спаліць сваё мінулае, авалодаць ім і недапусціць яго ўздзеяння на цяперашняе ў выніку паступова вяртання свету да вытокаў ці наадварот захаваць першасную генетычную памяць пры здзяйсненні магчымых сцэнарыяў армагедона і паступовага аднаўлення хаосу [6, с. 94 – 97,126].

Праславяне ведалі, што «яны ў гэтым свеце штосьці важнае. Калі свет размаўляў з чалавекам з дапамогай зорак, раслін, жывёл, рэк і гор, пор года і сутак, то і ён адказваў яму мовай сімвалаў – сваімі марамі і ўяўленнямі, сваімі татэмамі, сваёй здольнасцю паміраць і ўваскрашаць у рытуалах ініцыяцыі, пераўвасабляцца ў духа продка, калі апранаў рытуальную маску» [6, с. 146]. Сны, у якіх чалавек бачыў сваіх памерлых сваякоў, назіранне за прыродай, якая штогод засынала і абуджалася, усялялі ў яго думку, што продкі вяртаюцца да жыцця пасля смерці як і прырода. Такім чынам, у старажытным грамадстве дамінуючымі былі культ прыроды і культ памерлых.

На думку этнографа і даследчыка святочнай культуры Л. Абрамяна, ў татэмных продкаў аднымі з самых простых і распаўсюджаных спосабаў арганізацыі свята з'яўляліся прыёмы пераварочвання асноўных супрацьпастаўленняў, збліжэнне і адначасовае парушэнне іх меж [1, с. 132—134]. Яно цалкам адрознівалася ад будзённага жыцця і існавала як пэўны комплекс сакральнага, які праяўляўся ў абрадах збавення, выпраўлення здарэнняў парушэння або забароны, ахоўных мер супраць любых патэнцыяльных пагроз касмічнаму ладу, які згодна архаічным вобразным мадэлям абнаўляўся кожны Новы год. Сімвалічныя рытуалы абнаўлення ажыццяўляліся ў канцы аднаго цыкла і пачатку другога, што атаясамлялася са знішчэннем старога жыцця, за якім наступала новае. Галоўнымі кропкамі каляндарнага перыяду з'яўляліся дні зімовага і летняга сонцастаяння, падчас якіх прыёмамі маскіравання, упрыгожвання, травестацыі, драматычных прадстаўленняў і сродкамі інверсіі нашчадкі імкнуліся ажыццявіць прасторава-часовыя разрывы, ўваскрасіць момант міфічнага сусветнага пачатку і наладзіць сувязь з вялікімі першапродкамі, духамі касмаганічных істот [1, с. 134 – 135; 3, с. 228 – 229]. Свята ў першабытнасці прадугледжвала і ўжыванне звычайна табуіраваных алкагольных ці наркатычных рэчываў, якія змянялі свядомасць чалавека, умоўна пашыралі межы яго магчымасцей, адурманьвалі і стваралі «іншабыццё», у якім ён усведамляў сваё месца побач з багамі і міфічнымі героямі, здольным здзяйсняць подзвігі. «Крыніцамі натхнення для стварэння штучных абрадавых дзей былі «галасы», «бачанні», «адкрыцці» – пэўны рэлігійны вопыт, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суправаджаўся і ўзбагачаўся мноствам выключна жывых і драматычных узораў і сцэнарыяў» [6, с. 149]. Для пракракаў, спецыялістаў ў галіне сакральнага не было розніцы паміж сферай сну, галюцынацый і рэчаіснасцю. Яны з поўным даверам ставіліся да сваіх бачанняў, ўсялялі іх астатнім і прыўзнімалі таямнічую завесу далучэння да іншых пластоў быцця падчас свята.

Характар прамастацкай актыўнасці вызначаўся рытуальна-магічнымі ўяўленнямі і практычнай неабходнасцю. Абрадавыя скокі першабытных людзей, наскальныя малюнкі, арнаменты, тэатралізаваныя дзействы – відавочна былі злучаны з вытворча-паляўнічай магіяй, з культам урадлівасці. Ва ўсім гэтым бачыцца сінкрэтызм рэлігійнага, практычнага і эстэтычна-мастацкага пачаткаў.

Першапачаткова абрад забяспечваў бесперапынную перадачу ведаў, каштоўнасцей, інфармацыі для пасвячэння чалавека ў тайны прыроды, працэсу пераадолення чалавекам ўмоўнай мяжы ў часава-прасторавым вектары як «мінулае – сучаснае – будучае» і сацыяльна-асобасным, звязаным з пераходам ў новую якасць. Змест «абрадавага тэксту» перадаваўся пры дапамозе сімвалаў, якія ўмоўна выконвалі функцыю прыродных стыхій, ўзбуджалі эмоцыі і пачуцці ў індывіда або групы мовай рытуальнага рэквізіту, вербальных формул, танцавальных рытмаў, мастацка-вобразных схем. Выканаўцы абраду знаходзіліся ў вызначанай рытмічнай структуры, ажыццяўлялі пэўную паслядоўнасць элементаў: выкарыстоўвалі маскі, накладалі грым, апраналіся ў касцюмы хатніх і дзікіх жывёл, уваходзілі ў транс і прайгравалі пэўную сітуацыю ў прасторава-часовым кантынууме, набываючы новыя асобасныя якасці. Імітуючы розныя прыродныя стыхіі, паводзіны жывёл у «тэатральнай форме», продкі імкнуліся дасягнуць адзінства з багамі і міфічнымі героямі, упрасіць аб дапамозе, «навязаць» ім карыснае для чалавека рашэнне і далучыцца да іх магутнай сілы, каб уладарыць сусветам. Кожны эпізод сакральнай дзеі быў накіраваны на ўзаемадзенне паміж індывідумамі ў сінхронным (рэалізацыя інфармацыйнай сувязі паміж суб'етамі) і дыяхронным (ажыццяўляенне сувязі паміж пакаленнямі) планах. За межамі рэчаіснасці існавалі не толькі непасрэдныя продкі, але і заснавальнікі роду, заваёўнікі лепшых тэрыторый пассялення, легендарныя апекуны групы. Штучнае стварэнне сімвалічных сітуацый, якія валодалі цэласнасцю, завершанасцю, вызначанай унутранай логікай былі першым творчым працэсам чалавека. З абрадаў складваўся «актыўны механізм грамадскага жыцця, які творча падтрымліваў парадак і ствараў культуру» [4, с. 175], утрымлівае ў сабе квінтэсенцыю рэлігійнага вопыту, захаванага і замацаванага ў форме культурнай традыцыі.

Абрадавыяыя дзеі і ахвярапрынашэнні, якія паўтараліся бясконца ў архаічныя перыяды, падтрымлівалі карціну свету. Паступова ў працейшай радавой культуры складвалася ўстойлівае паняцце аб колазвароце касмічнага часу. Чалавек імкнуўся да вечнасці. Каб існаваў род, людзі павінны паміраць і нараджацца, падобна нябеснаму распаленаму колу, якое заўсёды пераходзіць з усходу на захад і яго нельга павярнуць назад. Жыццё рухалася ў адным кірунку, таму асноўнымі кропкамі цыклічнасці быцця з'яўляліся толькі нараджэнне і смерць. Паміраючы, чалавек сыходзіў у «той свет», каб потым, змяніўшы аблічча, ізноў нарадзіцца, прыйсці ў «гэты свет». Вясельныя цырымоніі, абрады ініцыяцыі і прысвячэння далучалі людзей да тагасветнага не літаральна, а сімвалічна, што выражалася ў пераажыванні дзеі, яе тэатралізацыі. Сімвалічнасць у дадзеным выпадку азначала магчымасць ізноў вярнуцца ў рэчаіснасць. Кожны з «пераходных» абрадаў увасабляўся праз сімвалічныя коды, семантыка якіх адпавядала асноўным функцыям рытуальных дзей.

**Спіс літаратуры**:


1. Абрамян, Л. Беседы у дерева / Л. Абрамян. — М. : Языки славянской культуры, 2005. – 270 с.
2. Гуревич А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гуревич. — М. : Искусство, 1984. — 350 с.
3. Кайуа, Р. Миф и человек. Человек и сакральное / Р. Кайуа. — М. : ОГИ, 2003. — 296 с.
4. Михаил, З. Этнолингвистические методы изучения народной духовной культуры / З. Михаил // Славянский и балканский фольклор : Реконструкция древне славянской духовной культуры: источники и методы. – М. : Наука, 1982. – 272 с.
5. Фрейд, З. «Я» и «Оно» (1923) // Фрейд, З. Я и Оно. — Тбилиси : Мерани, 1991. – Т. 1. — С.351–392
Элиаде, М. Аспекты мифа / М. Элиаде. – М. : Инвест-ППП, 1995. – 240 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ